■ Паміж намі

# МАЎЧЫ, СУМ...



НЕ, нічога дрэннага пра мужа яна сказаць не можа, нават зараз, калі яны пяць гадоў як разведзеныя і жывуць у розных канцах горада. Год таму да яго пераехала іх дачка. А Ніна засталася тут, у трохпакаёвай кватэры. Госці да яе заходзяць рэдка. Ды яна нікога асабліва і не запрашае...

Некалі ўсё было інакш. На святы тут збіраліся людзі, шмат людзей. Ніна ў доўгай прыталенай сукенцы без рукавоў (каб усе бачылі прыгожыя дагледжаныя рукі), з раскіданымі па плячах густымі валасамі спявала пад гітару. І нейк «гаслі» на яе фоне жонкі сяброў. Затое ў мужчын загараліся вочы і выпросталіся плечы. Яны раптам рабіліся галантнымі, жартавалі дасціпна і без «солі», імкнуліся падсунуць ёй «крэселка», падаць «талерачку», накінуць «шалічак»...

Муж завіхаўся на кухні: рэзаў хлеб, чысціў нажы і відэльцы, падаваў на стол гарачае, мыў брудны посуд... «Ніначка за дзень стамілася, ёй трэба адпачыць!..» О, ёй многія тады зайздросцілі. Муж не піў і — крый, Божа! — не біў. Хадзіў сустракаць з работы на аўтобусны прыпынак, а ў прыхожай станавіўся на калені, каб дапамагчы расшпіліць ёй боцікі.

Ну што тут яшчэ дадаць? Пашанцавала Ніне...

Але нездарма кажуць: калі ў цябе ўсё добра, не хвалюйся, гэта хутка міне... Нічога асаблівага ў іх жыцці быццам бы не адбылося. Знешне ўсё заставалася такім жа, як і раней. Толькі Ніна пачала ўсё часцей затрымлівацца на працы і падмяняць сябровак па суботах. А Валодзя не заўсёды мог яе сустрэць — не было з кім пакінуць маленькую Волечку. Часта Ніна прыходзіла дадому, калі яны ўжо спалі — дачка ў сваім маленькім ложку, а Валодзя — у крэсле побач.

Яна не вінавацiла сябе. Проста прайшло каханне. Так бывае. Ёй нецікава стала праводзіць вечары з гэтым чалавекам. Яе пачало раздражняць, што кожная рэч у яго заўсёды ляжыць на сваім месцы, што дачку ён корміць у адны і тыя ж гадзіны і ніколі не забывае павіншаваць са святамі сваякоў і сяброў. Усіх. Без выключэння. Заўсёды.

А Ніна была чалавекам настрою, імпульсаў. (Яны «пульсавалі» то ў адзін бок, то ў іншы.) Хутка заводзілася, загаралася... Часам яна нават ленавалася хлусіць. Прыходзіла дадому позна, і, не ведаючы, што прыдумаць, з парога скардзілася на галаўны боль. Валодзя без лішніх пытанняў лез у скрыначку з лекамі. Потым сядзеў побач, гладзіў яе па галаве: «Бедная мая...»

ДЗІЎНЫЯ істоты жанчыны. Хто зразумее, калі і чаго яны хочуць? Іх калашмацяць — яны просяць паратунку, ім дагаджаюць, кідаюць да іх ног усялякае-рознае, дарагое і каштоўнае — ім сумна, яны пазяхаюць... Іх некалі шчаслівы шлюб трашчаў па швах. Яна адкрыта кпіла з мужа і яго поспехаў на працы, смяялася, калі ён пачынаў сур'ёзна разважаць пра палітыку... У добрае надвор'е не ездзіла з ім на дачу (якая раней была мілейшай за родны дом) з-за «спякоты», у халоднае — з-за «макрэчы». А калі шчыра, проста часу не хапала на тую дачу...

Дачка ўжо вырасла, у дзясяты клас хадзіла. А Ніна закахалася — як дзяўчынка. У жанатага мужчыну, зразумела. А мужчына той — поўная супрацьлегласць мужу. Вясёлы, трошкі нават нахабны, па слова ў кішэню не лезе і перад тым, як што-небудзь зрабіць, гадзіну не разважае. Не тое што Валодзя: «Ніначка, табе так зручна?..»

І вырашыла Ніна чужога мужа адбіць. А што? Не яна першая, не яна апошняя. Крыміналу ў гэтым няма... Самай непрыемнай ва ўсёй гэтай справе была размова з Валодзем. Яна з жахам уяўляла сабе яго патэтычнае «Як ты магла?!», прыціснутыя да скроняў далоні і мора слёз... Ці не, лепш так: ён выскоквае з кватэры і бяжыць на апошні паверх, адтуль — на дах... (З-за куліс даносяцца раскаты грому. Заслона апускаецца... Шэкспір адпачывае!)

Аднак усё аказалася значна прасцей. Ніна ва ўсім прызналася. Муж ціха сабраў свае рэчы і сышоў у невядомым кірунку, нават не бразнуўшы для прыліку дзвярыма. Істэрыку закаціла дачка. Яна не хацела прызнаваць ніякага іншага тату. Але Ніна не надта перажывала з гэтай нагоды: сцерпіцца — злюбіцца...

З адыходам Валодзі ў кватэры пасялілася цішыня. Кветкі завялі, мэбля пакрылася слоем пылу. Волечка маўчала, размаўляла толькі з татам па тэлефоне, зачыніўшыся ў сваім пакоі. Ніна на ўсё махнула рукой. На той момант яе хвалявала адзінае пытанне: развядзецца Стас, у рэшце рэшт, са сваёй жонкай ці не. Каб хутчэй адвадзіць ад былой сям'і патэнцыяльнага мужа, Ніна пару разоў прыводзіла яго дадому і пакідала начаваць. Пасля чарговай такой начоўкі дачка, пакуль маці была на працы, сабрала свае рэчы і сышла.

**Муж ціха сабраў свае рэчы і сышоў у невядомым кірунку, нават не бразнуўшы для прыліку дзвярыма. Істэрыку закаціла дачка. Яна не хацела прызнаваць ніякага іншага тату.**

За ноч Ніна паставіла на ногі ўсе бальніцы і райаддзелы міліцыі. А раніцай патэлефанаваў Валодзя: «Волечка ў мяне, не хвалюйся». — «А ты сам дзе?» — «А я ў Ларысы...»

Ніне ад здзіўлення адняло мову... У Ларысы? У гэтай ціхоні, шэрай мышы, з якой некалі працавалі ў адным універсаме і нават лічыліся прыяцелькамі? Яна тады часта ў госці прыходзіла, сядзела сабе ў куточку, нікога не чапала, хіба што Валодзю талеркі са стала дапамагала прыбіраць. Трэба ж, як усё павярнулася... Ціхоня ціхоняй, а бач ты, на чужое ласая...

Заставалася адно — націснуць на Стаса. Ён заходзіў па вечарах, зрэдку заставаўся да раніцы і карміў абяцанкамі. Яна чакала. Не таму, што верыла, а таму, што іншай перспектывы не было.

У свой дзень нараджэння Ніна накрыла на стол і надзела доўгую сукенку. Тую самую. Дастала з антрэсоляў гітару, выцерла на ёй пыл. У прызначаны час патэлефанаваў Стас і сказаў, што прыйсці не зможа — малодшы сын захварэў, а жонка ў камандзіроўцы. Адразу пасля Стаса — Волечка: «Мам, мы цябе віншуем!» — «І цётка Ларыса?» — спытала Ніна. — «І яна таксама».

З паўгадзіны Ніна сядзела, утаропіўшыся ў пляму на шпалерах. «Вось табе і чысціюля, — падумала пра былога мужа без злосці. — Усё заўсёды прыбіраў, а гэтага не заўважыў...» Схамянулася, паморшчылася... Пухнатая кошка Анюта пацерлася аб нагу, выпрошваючы смачненькае. Ніна раздражнёна адштурхнула яе — тая ад нечаканасці чмыхнула, незадаволена патрэсла круглай пыскай і забілася ў кут за канапу. Ніна перавяла позірк на гітару... Устала, адкрыла кладоўку, дастала пласкагубцы — струны толькі зарыпелі...

Накінула паліто, выйшла на лесвічны пралёт, паднялася на дзявяты паверх, адчыніла акно, глянула ўніз — ноч, цемра, адзінокі ліхтар асвятляе жэсцяную «падсобку». «З Богам, родная!» — звесілася з падаконніка і кінула гітару ўніз...

Вярнулася ў кватэру, пайшла на кухню, паклікала Анюту... Тая, узрадаваная, ускочыла на калені, прыціснулася да гаспадыні.

«Ну што, дурында, адны мы з табой засталіся?» — Ніна пагладзіла калматае, падатлівае цельца. І ў гэты момант недзе зверху ці збоку, ці ўнутры — нявакна — раздаўся голас, які яна пазнала б сярод тысяч іншых: «Ніначка мая дарагая, ты стамілася... Выпі чаю...»

**Ала БЫВАЛАВА**

■ З канверта

## «ЯГАДКА»... З БОТАКСАМ



**Штодзень і на кожным кроку масавая культура спажывання ўнушае нам: жыццё належыць выключна маладым і прыгожым!.. Намажся крэмам, з'еш ёгурт, купі трэнажор — і будзеш заўсёды маладой, такой жа, як дваццацігадовая мадэль ці актрыса, якая той крэм (ёгурт) рэкламуе. Зразумела, усё гэта бізнес, індустрыя, велізарныя грошы — а ў выніку мы, у першую чаргу жанчыны, становімся закладнікамі добра распрацаванай схемы...**

Ніколі раней я не чула ад 25—30-гадовых столькі размоў пра тое, як яны не хочуць і баяцца старэць! Калі мне і маім сяброўкам было па 25, мы ўвогуле не думалі пра ўзрост, зморшчыны, даруй, Госпадзі, цэлюліт і пластычныя аперацыі. Ды і ўвогуле, не баяліся нейкіх «трыццацігадовых» ці, тым больш, «саракагадовых» рубяжоў. Сёння ж думка пра тое, што ты патрэбна камусьці, пакуль юная і свежая, атручвае існаванне і не дае спакою многім і многім жанчынам.

Маладымі сёння прынята лічыцца... да старасці. На мой уласны погляд, гэта дзіўна і, даруйце, смешна. У самім так званым сярэднім узросце няма нічога непрыняжальнага, а тым больш страшнага. Прыніжальна іншае — у 50—60 рабіць выгляд, што табе 25. Так, заўсёды знойдуцца дурніцы, якія будуць сцвярджаць, што гэта магчыма і што ім гэта ўдаецца. Але... жанчына «за 50» з добра зробленай падцяжкай (ботаксам, шліфоўкай) выглядае, як 50-гадовая жанчына з добра зробленай падцяжкай. Асабліва крыўдна за прыгожых, якім ёсць што псаваць: непатрэбныя маніпуляцыі па падцягванні і разгладжванні часта цалкам пазбаўляюць іх той няўлоўнай чароўнасці, якая прысутнічала раней.

Я не ханжа і не супраць догляду сябе. Але ж пры гэтым трэба адрозніваць жаданне «выглядаць добра» і імкненне «выглядаць значна маладзейшай за свой узрост». Першае — вітаецца, другое — немагчыма. Так што давайце міні-спаднiцы, каскады і чырвоную памаду пакінем сапраўды юным. Што застаецца нам, жанчынам «за...»? Вопыт, пачуццё гумару, уменне маўчаць, дараваць, разбірацца ў людзях і радавацца малому, талент цаніць кожную пражытую гадзіну, кожнага разумнага субяседніка, кожную шчырую ўсмешку... А гэта не так і мала, праўда?

**Ірына Мікалаеўна,**
**жанчына сярэдняга ўзросту**

■ Мужчынскі погляд

## Я ТАК БАЮСЯ ВЯСНЫ...

Цокаюць абцасікі па тратуарах. Ідзеш паперадзе — і міжволі хочацца азірнуцца. Быў бы крыху маладзейшы, можа, так і зрабіў бы. Як, зрэшты, і рабіў, неадноойчы, у гады юнацтва. А вось цяпер, калі нашмат пасталеў, неяк няёмка, хоць і карціць — жывы ж, як-ніяк!

Але іду, не азіраюся. Бог мой, як гэта пакутна — ісці не азіраючыся, калі ззаду такое спакуслівае цок-цок, цок-цок. Адбівае — быццам малаточкам, напаўняючы ўсю маю мужчынскую істоту прагай паглядзець — хоць бы краем вока! — якім жа ножкам належаць тыя абцасікі?

Можа, спыніцца, зрабіць выгляд, што развязаўся шнурок — і такім чынам прапусціць спакусніцу наперад?

Але я тут жа адганяю гэтую наіўную прыдумку, бо несур'ёзна ж неяк.... Зноў іду паперадзе тых абцасікаў, праўда, крыху павольней — у надзеі, што яны абгоняць мяне. І тады...

Я так баюся вясны. Чакаю — і баюся. Прычым гэты страх усё большае і большае, быццам цень, калі сонца хіліцца ў вечар. А можа, гэта невыпадкова, бо век мой таксама набліжаецца да жыццёвага вечара, калі раптам пачынаеш усведамляць, што нешта прайшло міма, нечага не паспеў — усё не хапала часу.

Эх, жыццёвая мітусня! Некуды спяшаемся, разменьваем час на дробязі, а калі азірнёмся — то лепшыя гады ўжо ззаду, за тым неабсяжным даляглядам, куды можна зазірнуць хіба ва ўспамінах...

Найбольш баюся вясны. Не восені, якая ўганяе ў маркоту зацяжнымі абложнымі дажджамі, не зімы, што сячэ ў твар калючым снегам-шротам, не лета нават, якое ў дрэннае надвор'е прыгнятае душу і цела...

Я так баюся вясны, бо яна, бессаромная, спакваля распранае дзяўчат-жанчын. І тады нашы вуліцы — быццам суцэльная выстава. Хоць ты заплюшчвай вочы, бо глядзець немагчыма! А яны, прыгажуні, свавольніцы, адчуваючы нашы мужчынскія позіркі, — вунь як блазнуюць! Нават самыя юныя, яшчэ, здавалася б, зусім падлеткі — а таксама туды ж. Прырода!

...Абцасікі ззаду ўсё цокаюць і цокаюць...

**Анатоль ЗЭКАЎ.**


Учреждение «Гомельская ЦСДЮШОР профсоюзов «Сож»

**ВЫСТАВЛЯЕТ НА ПРОДАЖУ**

**здание Центральной гребной базы**

**1978 года постройки, инвентарный номер 350/С-156880, расположенной на земельном участке площадью 0,2394 га с кадастровым номером 340100000007000144 по адресу: г. Гомель, ул. Перевалочная, 68. С дальнейшим проведением открытого аукциона.**

УНП 490423356

**Телефоны для справок: 8 (0232) 71-01-15, 8 (0232) 71-75-18.**

Утерянные бланки полисов формы 2 РП, 2РН серия КЕ № 0087089 и №0087090 **считать недействительными.** УНП 100985903

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу – (2РН, 2РП) серии БИ №№ 0911606, 0911607, 0911608, 0911609, 0911610, 0911611, 0911612, 0911613, 0911614, 0911615, 0953227, 0953228, 0953229, 0977769, 0977827, 0977828, 0977829, 0977830, 0977831, 0977832, 0977833, 0977834, 0986712, 0987661, 0828120, 0828121, 0828122, 0828123, 0828126, 0865937, 0876088, 0876092, 0879618, 0879619, 1379188, 1379189. УНП 100782388

П Р И Г Л А Ш Е Н И Е

**Открытое акционерное общество «Центр Моды» – организатор аукциона и арендодатель (220004, г. Минск, пр-т Победителей, д. 1)**

**проводит аукцион на право заключения договора аренды оборудования – конструкции сборно-разборной в собранном виде, расположенной по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 1 сроком на весенне-осенний период (ориентировочно с 01.05.2016 по 31.10.2016) и на условиях:**

| № лота | Предмет аукциона | Начальная цена аукциона (бел. руб.) | Площадь имущества (м.кв) | Размер арендной платы в месяц (в базовых арендных величинах) |
|---|---|---|---|---|
| Адрес: г. Минск, проспект Победителей, д. 1 | | | | |
| 1 | оборудование – конструкция сборно-разборная в собранном виде | 250 000 000 | 174,2 | 181 Арендная плата за первый месяц аренды уплачивается в полном объеме (181 БАВ), независимо от даты заключения договора |

**Аукцион состоится «28» апреля 2016 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, д. 1, каб. 18.**
**Контактный тел. 203-77-61. Дополнительная информация на сайте www.fashioncentre.by**
**Порядок оформления участия в аукционе: документы для участия в аукционе принимаются до 13.00 «27» апреля 2016 г. по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, д. 1, каб. 21.**

Лицу, зарегистрированному для участия в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Допущенный к участию в аукционе участник получает перед началом аукциона Аукционный номер.

**Победителем** признается лицо, согласившееся с максимальной ценой продажи лота. Оплата стоимости права аренды производится в течение 3 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона на р/с арендодателя. Договор аренды подписывается сторонами в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и утверждения протокола о результатах аукциона.

УНП 100649747